ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 4 (599) | Субота, 26 студзеня 1985 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## XXIV АБЛАСНАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

19 студзеня ў Доме палітычнай асветы абкома КПБ адбылася XXIV абласная справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя.

Ад камсамольскай арганізацыі нашага універсітэта дэлегатамі на канферэнцыі былі: рэктар ГДУ, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР 1984 года Б. В. Бокуць, сакратар камітэта ЛКСМБ В. Асіпенка, студэнты эканамічнага факультэта З. Дзенісенка, Г. Грыб, М. Карповіч, А. Барсукова з гістфіла, С. Лысенка — з фізічнага і У. Харэвіч — з матэматычнага факультэтаў.

З дакладам аб рабоце абкома камсамола за справаздачны перыяд выступіў першы сакратар абкома ЛКСМБ **Аляксандр Шалюта.**

Справаздачны даклад рэвізійнай камісіі абласной камсамольскай арганізацыі зрабіла намеснік старшыні камісіі **Вера Карповіч.**

Удзельнікаў канферэнцыі віталі піянеры і акцябраты.

На канферэнцыі з прамовамі выступілі першы сакратар абкома КПБ **А. А. Малафееў**, сакратар ЦК ЛКСМБ **А. П. Хандогін** і старшыня Паўднёвачэшскага абкома Сацыялістычнага Саюза Моладзі Чэхаславакіі **Эміл Прокеш.**

Дэлегаты канферэнцыі прынялі пастанову па справаздачнаму дакладу абласнога камітэта камсамола і зацвердзілі справаздачу рэвізійнай камісіі абласной камсамольскай арганізацыі.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел: загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ **Ю. П. Смірноў**, старшыня аблвыканкома **А. С. Камай**, другі сакратар абкома КПБ **У. П. Шаплыка**, сакратар абкома КПБ **С. П. Бабыр**, члены і кандыдаты ў члены бюро абкома КПБ **П. Т. Дземчанка, В. Д. Ляскоў, М. А. Мачуленка, Т. І. Радзькова, М. П. Гудзень, У. А. Лазько**, намеснік загадчыка аддзела моладзі лёгкай прамысловасці і сферы абслугоўвання ЦК ВЛКСМ **С. П. Каніпчаў.**

Адбыўся арганізацыйны пленум абласнога камітэта камсамола, выбранага XXIV абласной камсамольскай канферэнцыяй.

Першым сакратаром абкома ЛКСМБ выбраны **Аляксандр Шалюта**, другім сакратаром — **Валерый Мацюшэнка**, сакратарамі **Уладзімір Траццякоў, Таццяна Граблеўская.**

У састаў абласнога камітэта камсамола выбраны сакратар камітэта ЛКСМБ ГДУ **В. Асіпенка**, у састаў яго рэвізійнай камісіі — студэнтка эканомфака **Г. Грыб.**

### ІДЗЕ ЎСЕСАЮЗНЫ МЕСЯЧНІК АБАРОННА-МАСАВАЙ РАБОТЫ

## НА ЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

23-га студзеня пачаўся Усесаюзны месячнік абаронна-масавай работы, прысвечаны 67-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту і 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У жыцці нашага народа гэты месячнік стаў выдатнай заканамернасцю і ўключае ў сябе шырокае кола разнастайных масавых мерапрыемстваў. Асабліва насычаным ён будзе сёлета, у перыяд актыўнай падрыхтоўкі да XXVII з'езда КПСС, выбараў у Вярхоўныя Саветы саюзных рэспублік і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, слаўнага юбілею Перамогі.

Камітэт ДТСААФ, камітэт камсамола і прафком студэнтаў нашага універсітэта распрацавалі шырокую праграму мерапрыемстваў на ўсе дні месячніка. На факультэтах пройдуць сходы, прысвечаныя яго пачатку і падрыхтоўцы да 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Цяпер у чытальных залах бібліятэкі арганізуюцца выстаўкі літаратуры, прысвечаныя кіруючай ролі КПСС у ваенным будаўніцтве і слаўнаму баявому шляху Савецкіх Узброеных Сіл. Першакурснікі універсітэта арганізуюць калектыўнае наведванне краязнаўчага музея і сустрэчы з удзельнікамі вайны і партызанскага руху. Як заўсёды, з вялікай цікавасцю пройдзе Зорны агітпаход студэнтаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Гомельшчыны. Прадугледжана таксама правесці лыжны агітпрабег па маршруту Гомель — Лоеў — Гомель.

Студэнцкая група «Пошук» прадоўжыць напісанне летапісу баявой і працоўнай славы Цэнтральнага раёна г. Гомеля. На ўсіх факультэтах і ў інтэрнатах будуць наладжаны прагляды кінафільмаў «Маршал Жукаў Г. К.» (старонкі біяграфіі) і тэлеперадач, прысвечаных 40-годдзю Перамогі. У студэнцкіх аўдыторыях і Ленінскіх пакоях інтэрнатаў жаданымі гасцямі студэнтаў стануць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былыя партызаны і падпольшчыкі. Студэнты сустрэнуцца таксама з воінамі падшэфнай часці Гомельскага гарнізона.

На ўсіх факультэтах пройдуць ленінскія і грамадска-палітычныя чытанні і канферэнцыі на тэмы: «У. І. Ленін, КПСС аб абароне сацыялістычнай Айчыны», «КПСС — натхняльнік і арганізатар гераічнай барацьбы савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.». Масавымі мерапрыемствамі прадугледжан таксама шэраг лекцый, дакладаў, палітінфармацый і гутарак па палітычнай і ваенна-патрыятычнай тэматыцы.

У дні месячніка адбудуцца спаборніцтвы па праграме ўніверсіяды і спартакіяды «Здароўе», будзе арганізавана масавая здача нарматываў комплексу ГПА. У лютым студэнты прымуць удзел у камсамольска-маладзёжным лыжным кросе па маршруту: плошча У. І. Леніна — Курган Славы. Сапраўды масавымі стануць спаборніцтвы на першынство факультэтаў, інтэрнатаў, Усесаюзны тыдзень стральбы. Лепшыя спартсмены ГДУ рыхтуюцца дастойна выступіць на раённых, гарадскіх і абласных спаборніцтвах па ваенна-прыкладных відах спорту.

Усесаюзны месячнік абаронна-масавай работы ў нашым універсітэце паслужыць далейшай актывізацыі выхаваўчай работы сярод студэнцкай моладзі на лепшых рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа.

**В. АСІПЕНКА,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ,**
**У. КОЎШ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ.**

*У партыйных арганізацыях*

## НАВУЦЫ—ЭФЕКТЫЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ

У пярвічных партыйных арганізацыях факультэтаў ГДУ адбыліся першыя ў новым 1985 годзе адкрытыя партыйныя сходы. На парадку іх дня асноўным было пытанне аб выніках навуковых даследаванняў у мінулым годзе і задачах па іх далейшаму развіццю. З дакладамі выступілі: на эканамічным факультэце — намеснік дэкана М. В. Герасімчык, на матэматычным — дэкан У. Ф. Філіпцоў, на гісторыка-філалагічным — загадчык кафедры беларускай мовы У. В. Анічэнка, на біялагічным — загадчык кафедры хіміі Ю. А. Праляскоўскі, на геалагічным — сакратар партбюро Ж. А. Герасімава, на факультэце фізвыхавання — прафесар А. С. Калугін.

Дакладчыкі і выступіўшыя ў спрэчках камуністы і беспартыйныя ўсебакова прааналізавалі ўзровень навуковых дасягненняў як вучоных, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, так і студэнтаў. Размова вялася ў адпаведнасці з тымі высокімі патрабаваннямі, якія пастаўлены перад вышэйшай школай па развіццю навукі XXVI з'ездам КПСС, майскім (1982 г.) і кастрычніцкім (1984 г.) Пленумамі ЦК КПСС, іншымі пастановамі партыі і ўрада па гэтаму пытанню.

Вынікі сведчаць, што за апошні год зроблен прыкметны крок у развіцці універсітэцкай навукі. Аднак наяўныя рэзервы і магчымасці яшчэ выкарыстоўваюцца не поўнасцю. Не ўсе вучоныя і выкладчыкі займаюцца навуковымі распрацоўкамі, удзельнічаюць у выкананні дзяржбюджэтных і гаспдагаворных работ, маюць навуковыя публікацыі. Значна вышэйшым жадае быць эканамічны эфект НДР. На многіх кафедрах універсітэта ёсць добрыя магчымасці для прыкметнага павелічэння свайго ўкладу ў ажыццяўленне Харчовай праграмы СССР і шырокіх мерапрыемстваў партыі па далейшай меліярацыі зямель, у прыватнасці, беларускага Палесся.

На адкрытым партыйным сходзе фізічнага факультэта абмеркавана пытанне аб задачах яго партарганізацыі па павышэнню навукова-педагагічнага ўзроўню выкладання і актывізацыі выхаваўчай дзейнасці. З дакладам выступіла сакратар партбюро факультэта Т. П. Жалонкіна.

Па абмеркаваных пытаннях партыйнымі арганізацыямі прыняты адпаведныя пастановы.

У рабоце партыйных сходаў прынялі ўдзел і выступілі: на гістфіле — рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, на эканомфаку — прарэктар па навуковай рабоце прафесар М. В. Навучыцель, на біяфаку — член парткома Ф. М. Харытановіч.

## ЗІМОВАЯ СЕСІЯ—НА ФІНІШЫ









Сёння ва ўніверсітэце завяршаецца зімовая залікова-экзаменацыйная сесія. Для тых, хто вытрымаў яе паспяхова, пачнуцца дні адпачынку. Няўдачнікам давядзецца яшчэ папрацаваць, каб ліквідаваць «хвасты».

Па папярэдніх даных узровень паспяховасці сёлета прыкладна раўназначны мінулагодняму. Аб канчатковых выніках мы раскажам у адным з нумароў газеты. На гэтай жа старонцы змяшчаем фотаздымкі студэнтаў, якія парадавалі экзаменатараў выдатнымі ведамі.

Вышэйшым балам ацаніў адказ пяцікурсніцы біялагічнага факультэта па спецкурсу дэпутата гарадскога Савета Галіны Пашчанка загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывелін дацэнт А. І. Кіеня (на здымках уверсе).

Выдатную адзнаку па паліт-эканоміі заслужыла ў дацэнта В. П. Галеева студэнтка адной з лепшай на факультэце групы М-42 Святлана Леановіч.

Фота В. Ермаковай.

*Інтэрнат — твой дом*

# УЗНАГАРОДЫ ЗАСЛУЖЫЛІ КЛАПАТЛІВЫЯ

На пасяджэнні прэзідыума прафкома студэнтаў ГДУ падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшы інтэрнат, паверх, пакой універсітэта за 1984 год. З чатырох студэнцкіх інтэрнатаў ГДУ пераможцам прызнаны інтэрнат № 2, у якім жывуць студэнты матэматычнага факультэта (старшы куратар — асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі **С. Каморнікаў**). Названы факультэт прызнаны лепшым па арганізацыі быту і адпачынку студэнцкай моладзі. Тут усё робіцца для таго, каб узорным быў парадак, прадухіляліся выпадкі парушэння правілаў сацыялістычнага супольнага жыцця. Гэта дало свае станоўчыя вынікі: за апошнія два гады не было ніводнага выпадку высялення з інтэрната за амаральныя паводзіны.

Эфектыўна працуе студсавет інтэрната ў складзе 13 чалавек, які ўзначальвае чацвёртакурсніца Ала Кутаева. Рэгулярнымі сталі агляды-конкурсы на лепшы паверх, пакой, якія праводзяцца пад дэвізам: «Інтэрнат — твой дом. Зрабі яго ўзорным!». Пераможцы ўзнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола і прафкома студэнтаў, каштоўнымі падарункамі, актыў заахвочваецца паездкай па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Пры інтэрнаце працуе Клуб палітычнай і прававой прапаганды, у рамках якога чытаюцца лекцыі па актуальных пытаннях. Традыцыйнымі сталі «Дні кафедр», вечары пытанняў і адказаў, сустрэчы за «круглым сталом», з дэпутацкай групай, з прадстаўнікамі адміністрацыі і грамадскіх арганізацый ГДУ. Частыя госці жыхароў інтэрната — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія працуюць у нашым універсітэце.

Важная роля ў выхаванні студэнцтва адводзіцца тэматычным аб'яднанням, якія павышаюць культурны ўзровень моладзі, выхоўваюць эстэтычны густ, дапамагаюць у арганізацыі вольнага часу студэнтаў. Цікава праходзяць пасяджэнні вуснага часопіса «У свеце цудоўнага». Тэматыка іх вельмі разнастайная: «Дрэздэнская карцінная галерэя», «Паэзія — рух душы», «Музыка ў жыцці чалавека» і інш. Вялікай папулярнасцю ў жыхароў інтэрната карыстаецца аматарскае аб'яднанне «Гаспадынька». Тут дзяўчаты вучацца шыць, вязаць, рыхтаваць смачныя стравы. Заўсёды весела і цікава праходзяць вечары адпачынку, конкурсы «Ану, хлопцы!», «Ану, дзяўчаты!».

Яшчэ адной добрай традыцыяй стала спартакіяда па масавых відах спорту, якая праводзіцца па месцу жыхарства. З 1983 года яна праходзіць паміж інтэрнатамі ГДУ, Гомельскага політэхнічнага і Мазырскага педагагічнага інстытутаў.

Актуальнасцю і маляўнічым афармленнем прыцягваюць увагу стэнды ў холах інтэрната: «Квітней, родная Беларусь», «Жыццё У. І. Леніна», «Людзі гераічнага подзвігу», «З гісторыі фестывальнага руху». Рэгулярна выпускаюцца насценныя газеты, «маланкі», якія адлюстроўваюць быт студэнтаў.

У пакоях інтэрната № 2 — узорны парадак і чысціня. А лепшым з іх прызнаны пакой № 305 (староста — чацвёртакурснік **Аляксандр Дзенісенка**). Сярод паверхаў пераможцам у аглядзе-конкурсе названы 5-ты паверх (староста — студэнтка 3-га курса **Наталля Іванчыкава**).

Другое месца па арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў у інтэрнаце заняў эканамічны факультэт (ст. куратар — асістэнт кафедры палітэканоміі **У. Зарэцкі**), другое — гістфіл (куратар інтэрната — асістэнт кафедры рускай літаратуры **Л. Дземянцей**). Чацвёртае, пятае, шостае і сёмае месцы занялі адпаведна біялагічны, геалагічны факультэты, факультэт фізвыхавання і фізічны факультэт.

У інтэрнаце № 1 (старшыня студсавета — другакурснік фізічнага факультэта — **Міхаіл Букатаў**) лепшым стаў чацвёрты паверх (староста **Аляксандр Кухараў**) і пакой № 341 (староста — **Ларыса Шыгалёва**).

Пераможцамі у інтэрнаце № 3 (старшыня студсавета — чацвёртакурснік гістфіла **Аляксандр Ражко**) стала кватэра № 144 (староста **Святлана Яфімава**) і пад'езд № 4 (староста **Наталля Грамыка**).

Лепшыя пакой і паверх у інтэрнаце № 4 (старшыня студсавета — першакурснік эканомфака **Сяргей Цімохін**) — № 910 (староста — студэнтка 3-га курса геафака **Алена Бондарава**) і шосты паверх (староста — студэнт эканамічнага факультэта **Фёдар Белаш**).

Сярод ленінскіх пакояў інтэрнатаў пераможцам названы пакой інтэрната № 4 на пятым паверсе (староста паверха — **Аляксандр Бадуноў**).

Па ўмовах агляду-конкурсу старасты пакояў і паверхаў, якія занялі 1-е месца, узнагароджаны грашовай прэміяй. Актыў інтэрната № 2 заахвочан турыстычнай паездкай па маршруту: Гомель — Калінінград — Ленінград — Пскоў — Гомель.

Работа ў інтэрнатах ГДУ праводзіцца значная. Аднак яе можна зрабіць яшчэ больш разнастайнай і эфектыўнай. У прыватнасці, студсавету інтэрната № 4 варта падумаць над тым, як стварыць тут хаця б адно аб'яднанне па інтарэсах. Больш дзейсна павінны працаваць студсаветы і іншых інтэрнатаў.

**А. ПАЧЫЦКІ,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома студэнтаў, чацвёртакурснік геалагічнага факультэта.**

*Нашы юбіляры*

# АДДАНАСЦЬ ГЕАЛОГІІ

За плячыма прафесара Г. А. Кузняцова — 60 гадоў. Ён належыць да пакалення тых людзей, на долю якіх выпала шмат выпрабаванняў. У снежні 1942 года пасля трох месяцаў вучобы на першым курсе геалагічнага факультэта Іркуцкага дзяржаўнага універсітэта ён становіцца салдатам арміі, якая размяшчалася ў Забайкаллі. Прымаў удзел у разгроме японскіх войск і пасля перамогі яшчэ пэўны час працягваў службу ў радах Савецкай Арміі. У верасні 1947 года Г. А. Кузняцоў вяртаецца ў сцены Іркуцкага дзяржуніверсітэта, які заканчвае з адзнакай. Як аднаго з лепшых выпускнікоў яго прымаюць у аспірантуру пры кафедры гісторыі геалогіі ІДУ. Пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі малады вучоны працуе асістэнтам, выкладчыкам, а затым на працягу трох гадоў дацэнтам той жа кафедры.

У 1962 годзе Г. А. Кузняцоў быў выбраны загадчыкам кафедры гістарычнай геалогіі, а пазней — дэканам геалагічнага факультэта.

У час вучобы ва універсітэце і аспірантуры, у перыяд выкладчыцкай дзейнасці Георгій Аляксеевіч працаваў па сумяшчальніцтву старшым калектарам, начальнікам атрада і экспедыцыі, начальнікам і старшым геолагам партыі геалагічных упраўленняў Міністэрства геалогіі СССР, навуковым кіраўніком савецка-мангольскай комплекснай экспедыцыі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

Г. А. Кузняцоў — аўтар 15 навуковых геалагічных справаздач, яго пяру належыць больш ста апублікаваных прац, у тым ліку — 6 манаграфій. Пад яго кіраўніцтвам напісана і абаронена 11 кандыдацкіх дысертацый.



Прафесар Г. А. Кузняцоў — удзельнік Пражскага (1968 г.), Канадскага (Манрэаль, 1972 г.) і Маскоўскага (1984 г.) міжнародных геалагічных кангрэсаў, а таксама міжнароднага сімпозіума гісторыкаў геалогіі ў Будапешце (1982 г.).

У нашым універсітэце Георгій Аляксеевіч працуе з 1974 года. Ён з'яўляецца лаўрэатам ленінскіх чытанняў ГДУ 1984 года.

Г. А. Кузняцоў — член Секцыі навук аб Зямлі савецкага нацыянальнага аб'яднання гісторыкаў і філосафаў прыродазнаўства і тэхнікі, член міжрэспубліканскага навуковага савета па праблемах Палесся пры Прэзідыуме АН БССР. Ён кіруе цыклам лекцый абласнога таварыства «Веды» па праблеме «Эфектыўнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў па ахове навакольнага асяроддзя», уваходзіць у састаў рэдкалегіі рэспубліканскага навуковага зборніка «Геалогія і геаграфія».

За заслугі перад Радзімай Георгій Аляксеевіч Кузняцоў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і 8 медалямі. Ён удастоены таксама грамат Прэзідыума Вялікага Народнага Хурала і Міністэрства асветы МНР.

Увесь калектыў геалагічнага факультэта горача віншуе Вас, Георгій Аляксеевіч, з 60-годдзем з дня нараджэння і жадае далейшых поспехаў у шматграннай навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

**Ж. ГЕРАСІМАВА,**
**сакратар партбюро геалагічнага факультэта.**

*Па слядах нашых выступленняў*

# ДЫСЦЫПЛІНА І ЯШЧЭ РАЗ—ДЫСЦЫПЛІНА!

Паляпшэнне выхавання і адукацыі студэнтаў-педагогаў — задача надзённая і адказная, таму што ад якасці падрыхтаванага спецыяліста залежыць заўтрашні і кожны наступны дзень нашай агульнаадукацыйнай школы. Для спецыяліста важны не толькі яго веды, кваліфікацыя, але і ініцыятыўнасць, дзелавітасць, арганізаванасць, гэта значыць высокая агульная культура, якую ён будзе падтрымліваць або ўкараняць у сваім калектыве. Але пералічаныя якасці не прыходзяць самі сабой, яны закладваюцца ў сям'і, развіваюцца ў школе, удасканальваюцца ў вышэйшай навучальнай установе.

У бягучым навучальным годзе газета «Гомельскі універсітэт» апублікавала некалькі крытычных матэрыялаў аб дрэнным наведванні студэнтамі вучэбных заняткаў на розных факультэтах. Думаецца, што трывога рэдакцыі ўпаўне абгрунтаваная, а пытанне наведвання лекцый не такое ўжо і дробязнае, асабліва калі ўлічыць, што заняткі прапускаюць не выдатнікі. Да таго ж ў час пропускаў яшчэ ні адзін студэнт не сядзеў у лабараторыі, вучэбным кабінеце ці бібліятэцы. Гэты час, я глыбока перакананы, заўсёды траціцца ўпустую, на шкоду будучаму спецыялісту. Ад гэтага церпіць урон і справа адукацыі, і справа выхавання. Таму кожны беспадстаўны пропуск заняткаў на гісторыка-філалагічным факультэце лічыцца самым сур'ёзным парушэннем вучэбнай дысцыпліны. Пэўны поспех у навядзенні парадку можа быць дасягнуты ў выніку арганізаваных дзеянняў дэканата і грамадскіх арганізацый факультэта. На гэтым спынюся больш падрабязна.

На нашым факультэце рабочы дзень дэкана, яго намесніка пачынаецца з аналізу рапарцічак за мінулы дзень. Там, дзе складваецца ненармальнае становішча з наведваннем, прымаюцца самыя рашучыя меры. Так, па выніках праверкі на другім курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры вымушаны былі на некаторых студэнтаў накласці спагнанні. Гэты факт стаў прадметам абмеркавання на камсамольскіх сходах груп, на семінары куратараў. Характэрна, што на патрабавальнасць студэнты рэагуюць у большасці хутка і правільна.

Сур'ёзны ўплыў на наведванне заняткаў аказвае вучэбна-выхаваўчая камісія, якую ўзначальвае студэнт першага курса Васіль Дубік. Абмеркаванне на пасяджэнні камісіі ўжо само па сабе дысцыплінуе, не кажучы нават пра спагнанні, а яны ў нас заносяцца ў асабістую картку студэнта ў адпаведную графу. У першым семестры на пасяджэнні камісіі абмеркавалі паводзіны Ірыны Артамоненка, Ігара Майсеева, Сяргея Вараб'я.

Апошнім часам актывізавалася работа «Камсамольскага пражэктара» (адказная Ірына Асташкевіч). Дзейнасць яго стала больш канкрэтнай і аператыўнай. У адным з выпускаў, напрыклад, крытыкаваліся тыя, хто меў запазычанасць за мінулы год, у другім — апублікаваны вынікі рэйду дэканата, вучэбна-выхаваўчай камісіі і «Камсамольскага пражэктара». Гэта фотаабвінавачванне, дапоўненае ўзятымі ў парушальнікаў інтэрв'ю, яшчэ і сёння прыцягвае ўвагу сваёй баявітасцю.

Лічу, што было б несправядлівым прэтэнзіі за пропускі заняткаў скіроўваць толькі да студэнтаў. Дрэннае наведванне, спазненні часам з'яўляюцца рэакцыяй студэнтаў на нядбайныя адносіны да вучэбнага часу саміх выкладчыкаў. На жаль, у пачатку навучальнага года давялося папярэджваць выкладчыкаў за спазненні, за несвоечасовае заканчэнне заняткаў, перанос іх на іншы час. Апрача таго, убачыўшы на занятках у выкладчыка неэфектыўнае, неашчаднае выкарыстанне часу, асобныя студэнты таксама пачынаюць бяздумна траціць яго, нават прапускаць заняткі. На пытанне, чаму ў вас на лекцыі па гісторыі БССР на другім курсе рускага аддзялення з 74 студэнтаў адсутнічала 29, выкладчык стэрэатыпна адказаў: «Гэта не мая справа!» Партыйная арганізацыя, дэканат паставілі за мэту разбурыць гэты шкодны, памылковы стэрэатып. Загадчыкі кафедр, вопытныя выкладчыкі, абмяркоўваючы наведаныя заняткі, тэксты лекцый, патрабуюць ад аўтараў глыбока навуковага зместу, актуалізацыі праблематыкі і інфармацыі, эмацыянальна - дынамічнага выкладу.

Прыхільнікаў меркавання «наведванне — не мая справа» я лічу людзьмі абыякавымі і да сваёй прафесіі, свайго прадмета, і, што асабліва небяспечна, раўнадушнымі да лёсу сваіх выхаванцаў. У нядаўніх выпускнікоў школы яшчэ не склаліся характары, не канчаткова сфарміраваўся светапогляд, часам не хапае ўседлівасці, настойлівасці, мэтанакіраванасці. Кантроль жа пасля школы значна паслабіўся. Да таго ж, у ліку студэнтаў зрэдку аказваюцца людзі з неглыбокімі ведамі ці з няўстойлівым навыкам самастойнай працы. Абавязак выкладчыка любога рангу—даць дадатковую кансультацыю, магчыма, індывідуалізаваць заданні, правесці калёквіум, а магчыма, проста пагаварыць як старэйшаму са студэнтам, каб папярэдзіць неарганізаванасць ці зняць непатрэбную заспакоенасць, самаўпэўненасць. Таму многія выкладчыкі нашага факультэта, асабліва моваведы, зрабілі правілам: кожныя прапушчаныя заняткі студэнт павінен адпрацаваць, гэта значыць, падрыхтаваць рэферат па прапушчанай тэме або заканспектаваць указаную літаратуру, выканаць дамашняе заданне, уключаючы і дадатковыя практыкаванні для самастойнай работы. Зразумела, што ўсё гэта патрабуе затраты часу, энергіі, і не кожны выкладчык добраахвотна згаджаецца на такую справу, але спадзяёмся, што з цягам часу ўсведамленне свайго высокага выкладчыцкага абавязку стане перакананнем кожнага супрацоўніка факультэта. Менавіта на гэта скіравана работа дэканата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый нашага факультэта.

**М. ГУЛІЦКІ,**
**дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта, дацэнт.**

*ДАСЛЕДУЮЦЬ ВУЧОНЫЯ*

# ПАЛЕСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ

«Вяселле — самы ўрачысты абрад у жыцці беларускага народа. Гэта своеасаблівая народная опера з пралогам, драматычнай кульмінацыяй і-заўсёды шчаслівым заканчэннем. Народ стагоддзямі дасканаліў, калі можна так назваць, лібрэта гэтае оперы, якая надзвычай багата насычана спевамі, музыкай, танцамі, вострым дыялогам, гумарам», —так яскрава і характэрна напісаў пра адзін з самых цікавых сямейных абрадаў народны артыст СССР Р. Р. Шырма. Наогул, гэтая тэма шырока распрацоўваецца многімі беларускімі фальклaрыстамі і этнографамі. Важнае значэнне ў распрацоўцы праблем агульнабеларускага фальклору, у тым ліку і вяселля, мае Палессе, як край, які дбайна захоўвае сваю багатую гісторыю і культуру. У гэтым русле нядаўна выйшла вельмі карысная кніга «Палескае вяселле»[1]), якую выпусціла выдавецтва «Университетское», а ўкладанне і рэдагаванне яе зрабіла добры знаўца фальклору, дацэнт БДУ В. А. Захарава.

Гэтае выданне не можа не прыцягнуць увагу шырокага кола чытачоў, фальклaрыстаў, студэнтаў-філолагаў, каму яно ў першую чаргу і прызначаецца. Адразу кідаецца ў вочы яе добрае афармленне. Тут — каляровыя і чорна-белыя здымкі, якія паказваюць выканаўцаў, розныя этапы традыцыйнага і сучаснага вяселля. Раздзелы кнігі адкрываюцца эпіграфамі. Некаторыя песні пададзены з нотамі, ёсць навуковы каментарый. Аснову выдання складаюць песні, што запісаны студэнтамі філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна на працягу апошніх 20 гадоў. Дарэчы сказаць, што зборы фальклорных твораў, сабраныя студэнтамі пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў універсітэта, паспяхова выдаваліся і раней. І сёння мы павінны канстатаваць пра яшчэ адзін такі поспех.

Уступны артыкул пра фальклор і сучаснасць, навуковае ізлажэнне палескага вясельнага абраду напісала В. А. Захарава. Беларускае Палессе «добра захоўвае традыцыйныя элементы ўсёй славянскай духоўнай культуры, — піша вучоны ў ім. — Палессе знаходзіцца паміж тэрыторыямі, на якіх сфарміраваліся тры родасныя народы ўсходне-славянскага паходжання — рускі, беларускі, украінскі. На захадзе яно прымыкае да іншых славянскіх тэрыторый. Тут здаўна адбывалася ўзаемадзеянне розных этнічных культурных традыцый, якія неслі глыбокія гістарычныя карані». Такое вялікае значэнне фальклору гэтага рэгіёна справядліва прыдае даследчыца. Яна паказвае гісторыю вывучэння вяселля, яго генезіс. Вучоны разглядае абрад не толькі ў агульным плане, але выдзяляе таксама адметныя рысы іменна палескага вяселля, якое заснавана па «каравайнаму абраду». Яно пачало развівацца яшчэ з радавога ладу, калі існаваў матрыярхат. Свае вывады аўтар работы падмацоўвае запісамі песень, якія данеслі з сівой мінуўшчыны карысныя звесткі пільнаму гісторыку, этнографу, фальклaрысту. І перад намі раскрываюцца тайны: чаму важнае месца ў абрадзе належыць караваю, адкуль з'явіліся ў нашых продкаў багі Род і Рожаніцы, тлумачацца іншыя, на першы погляд, незразумелыя месцы ў народных песнях і абрадзе.

Даследчыца выдзяляе наступныя этапы палескага вяселля: 1) пярэпыты; 2) сватанне; 3) запоіны; 4) вянкі; 5) каравай; 6) першы дзень вяселля; 7) другі дзень вяселля; 8) трэці дзень вяселля; 9) госці. Гэтыя і іншыя вывады зроблены на аснове багатага матэрыялу, Так, песні запісаны амаль у 30 палескіх раёнах.

У зборніку асобным раздзелам змешчана «Вяселле ў Дружылавічах» (Іванаўскі раён), якое запісала тады яшчэ аспірантка БДУ, а цяпер асістэнт кафедры рускай літаратуры ГДУ, Л.Л. Дзямянцей. Хаця не ўсе песні (іх каля 200), запісаныя ў гэтай вёсцы, што выконваюцца на вяселлі, трапілі ў разглядаемы зборнік, аднак дзякуючы дбайнаму збіральніку, перад намі паўстае ва ўсёй сваёй прыгажосці і прывабнасці палескі вясельны абрад, які яскрава дапаўняе наша ўяўленне пра сямейна-абрадавую паэзію нашага краю.

У цэлым зборнік з'яўляецца важным дапаўненнем да даследавання, якое праводзіцца вучонымі, вялікім грунтоўным матэрыялам да тамоў «Вяселле», якія выпускаюць калектывы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР у выдавецтве «Навука і тэхніка». Варта сказаць, што матэрыялы пра вяселле вучоныя змяшчаюць у 6 вялікіх кнігах.

Аўтар «Палескага вяселля» тэматычна класіфіцыруе народныя песні па 24 асноўных раздзелах (напр., Сватанне. Запоіны. Вянкі. Каравай. Першы дзень вяселля. У маладога, калі збіраюцца ехаць па маладую. У маладой да прыезду маладога. У застоллі і г. д.). У прыгаданым шматтомным зводзе «Беларускай народнай творчасці» класіфікацыя найбольш шырэйшая, ды гэта і зразумела, бо акадэмічныя вучоныя аперыруюць большым матэрыялам, сабраным не адным пакаленнем фальклaрыстаў па ўсёй Беларусі. Параўноўваючы два выданні, таксама заўважаеш, што даследаванні вучоных дапаўняюць адно аднаго, дзе ўносяць свежы струмень і пацвярджаюць асноўныя вывады, зробленыя папярэднікамі, паказваюць шляхі далейшага вывучэння і даследавання праблем беларускага фальклору.

**Алесь ЛОЗКА,**
**выпускнік ГДУ, аспірант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.**

[1]) Палескае вяселле (Уклад. і рэд. В. А. Захаравай). — Мн.: Выд-ва «Университетское», 1984.



ЗІМОВЫЯ ЗАБАВЫ. Фота С. Коваля.

# У СВЕЦЕ МУДРЫХ ДУМАК

**Хочешь быть умным, научись разумно спрашивать, внимательно слушать, спокойно отвечать и переставать говорить, когда нечего больше сказать.**

**И. ЛАФАТЕР.**

**...для того чтобы усовершенствовать ум, надо больше размышлять, чем заучивать.**

**Р. ДЕКАРТ.**

**Все жалуются на свою память, но никто не жалуется на свой ум.**

**Ф. ЛАРОШФУКО.**

**Сильный ум, преследующий практические цели, — лучший ум на земле.**

**В. ГЕТЕ.**

**Гибкость ума может заменить красоту.**

**СТЕНДАЛЬ.**

**Разум дан человеку для того, чтобы он разумно жил, а не для того только, чтобы он видел, что он неразумно живет.**

**В. Г. БЕЛИНСКИЙ.**

**Величайшая слабость ума заключается в недоверчивости к силам ума.**

**В. Г. БЕЛИНСКИЙ.**

**Старайся дать уму как можно больше пищи.**

**Л. Н. ТОЛСТОЙ.**

**Разум, даже если его притесняют и пренебрегают им, в конечном счете всегда одерживает верх, ибо жить без него невозможно.**

**А. ФРАНС.**

**Жаден разум человеческий. Он не может ни остановиться, ни пребывать в покое, а порывается все дальше.**

**Ф. БЕКОН.**

*Прапануе кнігарня*

# ДЛЯ СТУДЭНТАЎ І ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Магазін № 5 «Навукова-тэхнічная кніга» прапануе наступную літаратуру:

САРЖЭЎСКІ А. М. Оптыка. У 2-х тамах. Т. І. Вучэбны дапаможнік для фізічных спецыяльнасцей універсітэтаў. — Мн., выдавецтва «Университетское», 1984 г.

Кніга напісана ў адпаведнасці з новай праграмай курса агульнай фізікі. Акрамя праграмнага матэрыялу вялікая ўвага ўдзяляецца прыкладным праблемам оптыкі.

КАЛЮНОЎ В. Н. Фактар росту нярвовай тканкі. — Мн., Наука и техника, 1984 г.

Кніга разлічана на выкладчыкаў і студэнтаў біялагічных факультэтаў універсітэтаў, педагагічных і медыцынскіх інстытутаў.

Геаграфія Беларусі. Вучэбны дапаможнік для геаграфаў і біёлагаў. Пад рэд. М. С. Вайтовіча, Б. Н. Гурскага. — М., Высшая школа, 1984 г.

У кнізе разглядаюцца прыродныя ўмовы, рэсурсы і іх ахова, поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі рэспублікі, дасягнутыя за гады пяцігодак.

ГУСАК В. А. Вышэйшая матэматыка. Т. І. Вучэбны дапаможнік для прыродазнаўчых спецыяльнасцей універсітэтаў. 2-е выд., перапрацаванае і дапоўненае. — Мн., Выд. БДУ, 1983.

Адрас магазіна «Навукова-тэхнічная кніга»: пр. Леніна, 45.

# ВЯСЁЛАЯ СУБОТА

## НА ЭКЗАМЕНЕ

Вы атрымалі двойку. Парада: ідзіце да дэкана, рабіце засмучаны выгляд і кажыце, які вы няўдачлівы, бедны. Ведайце, што гэта — першая арыя, і ў дэкана яна не выкліча патрэбных эмоцый, а толькі падрыхтуе глебу.

У другой арыі неабходна заняцца самабічаваннем: дзве старонкі не дачытаў, а яны мне і папаліся. Які я дрэнны, нікчэмны і г. д. На гэта дэкан скажа, што вам не трэба кідаць вучобу. Тады вы пачынайце выконваць гімн фінансам. Гэта дзейнічае безадказна. Вы атрымаеце накіраванне на пераздачу.

* * *

—Уяўляеце, прафесар, мне сёння нават у сне прыснілася, што я рыхтуюся да экзамена.

— Ну дык ідзіце спаць, можа вам прысніцца, што вы яго здалі.

## УСМЕШКІ МАСТАКА





— Паглядзі, які дзіўны студэнт. Канспектуе лекцыю алоўкам!

На Марсе.
— Што гэта там, за рух на Зямлі?
— Гэта ў ГДУ ідзе сесія.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Калектывы выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў фізічнага факультэта і падрыхтоўчага аддзялення глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці былога старшага выкладчыка ШАФАРЭНКІ Віталя Мікалаевіча і выказваюць глыбокае спачуванне сям'і і блізкім памёршага.**

А322045
«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.